10. Бодак А.Ю. Социально-экономическая жизнь г.Кобрина и кобринского уезда по состоянию на сентябрь 1939г.//Моладзь Берасцейшчыны - 1997г.
11. Вабішчэвіч А. Нацыянальная школа ў Заходняй Беларусі (1921-39гг.)// Беларуская мінуўшчына - 1998 - №1
12. Винниченко І. Українци Берестейщини, Підляшшя й Холмщини в пер.пол. ХХст.. Хроніка подій - Київ, 1997.
13. Мисиюк В. «Москалефильство» и польско-украинская «Згода»// Моладзь Берасцейшчыны - 1999г.
14. Полуян В. А., Полуян И. В. Революционное и национально-освободительное движение в Западной Белоруссии в 1920-39 гг. - Минск: Госиздат БССР, 1962.
15. Рудовіч С.С. Аляксюк Павел Паўлавіч//Энцыклапедыя гысторыі Беларусі т.1, Мінск: 1993.
16. Mały rocznik statystyczny - Warszawa: Główny Urząd statystyczny Rzeczypospolitej Polski, 1939.
17. Podział administracyjny państwa a zagadnienia narodowościowe// Sprawy narodowościowe T.V - 1996 - zesz.2(9)
18. Archiwum akt nowych (AAN) syg.296/II - 19
19. AAN syg.975/85
20. Дзяржаўны архіў Брэсцкай обласці ф.1оп.9с.1315

*Малыхіна Л.Ю. (БрДТУ, Брэст)*

## РЫЖСКІ ДАГАВОР 1921 г. У ДАКУМЕНТАХ “АРХІВАЎ БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ РЭСПУБЛІКІ”

Унікальнае выданне сусветнага значэння з’явілася пад канец XX стагоддзя - апублікаваны першыя 2 кнігі I тома зборніка дакументаў, якія тычацца ўзнікнення першай нацыянальнай дзяржавы ў беларусаў - “Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі” пад рэдакцыяй С. Шубы. Аўтарам былі апрацаваны малавядомыя матэрыялы з Літоўскага дзяржаўнага архіву і дакументы, якія знаходзяцца за мяжой у прыватных бібліятэках і сховішчах беларускіх аб’яднанняў. Як спадзяецца С. Шупа, далейшая публікацыя мінскага фрагменту дапаможа аднавіць поўную гістарычную карціну перыяда 1917-1925 гг. Багаты змест выдання - фотадакументы і лісты, ноты і дэкларацыі, цыркуляры і фінансавыя акты (усяго 3 837 дакументаў) - дазволіў увесці ў навуковы абарот новыя крыніцы і з новага ракурсу асэнсаваць галоўныя падзеі навейшай гісторыі. У прыватнасці, заключэнне мірнага Рыжскага дагавора 1921 г.

Акрамя непасрэдных удзельнікаў мірнай канферэнцыі ў Рызе - Савецкай Расіі, Украіны і Польшчы - існаваў яшчэ адзін зацікаўлены ў выніках перамоў бок - самі беларусы. Якім жа чынам урад Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР) стаў змагацца за інтарэсы народа? Матэрыялы кнігі: пратэсты-прапановы ў міжнародныя органы, перапіска паміж членамі ўрада, даклады для службовага карыстання дапамагаюць саставіць уяўленне аб гэтым.

Перш за ўсё, дакументацыя па сакавіцкаму дагавору адлюстравала падмечаную тэндэнцыю: дзейнасць урада БНР была накіравана пераважна на падтрымку міжнародных зносін. Спачатку ўрад В. Ластоўскага шукаў кантактаў з РСФСР - у ліпені 1920 г. у Расіі знаходзілася дыпламатычная місія на чале з Я. Варонкам. Урад БНР 2 і 5 (паўторна) верасня 1920 г. адаслаў заявы Савецкаму і Польскаму ўраду аб сваім жаданні ўдзельнічаць у мірных перамовах. Адказу на іх не было [с. 1193]. Суседзі - Расія і Польшча - сваю пазіцыю па беларускаму пытанню выказалі падчас прэлімінарнага дагавору 12.10.1920 г. Жаданай падтрымкі прапаноў ўрада БНР не атрымала. Чаму так адбылося? У некаторай ступені адказ даецца ў *"Рапарце паўнамочнага дыпламатычнага прадстаўніка БНР у Літве Антона Аўсяніка старшыні Рады Народных Міністраў БНР Вацлаву Ластоўскаму за 12.01.1921."* У паведамленні аб выніках размовы з дыпламатычным прадстаўніком РСФСР у Літве Аксельродам мы бачым довады апошняга: бальшавізм лічыць нацыянальныя ідэі буржуазным перажыткам; беларускую дзяржаўнасць разглядае ў значэнні тэрытарыяльна-абласным; "Савецкая Беларусь федэратыўна звязана з Савецкай Расіяй, а гэта значыць, што і юрыдычна і фактычна незалежнасці Беларусь не мае". Аўтарам рапарта адмаўляецца нават ідэя аб неабходнасці перамоў паміж урадамі БНР і БССР - яны "умацавалі б яшчэ большае перакананне, як некаторых дзяржаў Еўропы, так і самой Савецкай Расіі, што справа беларуская - хатняя справа Расіі" [с. 1009-1013].

Падтрымкі сваіх патрабаванняў захаваць цэласнасць Беларусі можна было шукаць толькі ў прадстаўнікоў міжнародных арганізацый. Хstation? Храналагічна першым з прыведзеных пасланняў з'яўляецца *"Ліст Аўгена Ладнова (Парыж) прэзыдэнту Канфэрэнцыі Паслоў (Парыж) за 14.08.1920 з просьбай падтрымаць дамаганьні Беларусі аб удзеле ў польска-расейскіх мірных перамовах"* [с. 844].

У залежнасці ад пройдзенага ад мірных перамоў часу характар дакументаў у "Архівах..." змяняецца. У *"Пратэсце Ураду БНР за 25.03.1921 у справе падпісаньня Міравой умовы паміж Польшчай і Расеяй 18.03.1921 у Рызе "Усяму культурнаму сьвету"* гаворыцца: "Рыжскі Польска-Бальшавіцкі мір гэта кашмарная насмешка над дэмакратыяй і яе ідэаламі. Імя яму насілле і грабёж". [с. 1058-1059]. Яшчэ па гарачых слядах састаўляецца заява міністра міжнародных спраў, старшыні Рады Народных Міністраў на імя старшыні Літоўска-Польскай канферэнцыі ў Бруселі Полю Імансу аб пазіцыі урада БНР. У лісце, хаця і сцвярджаецца, што Беларусь ні у якім выпадку не адмовіцца ад сваіх правоў на этнаграфічна-беларускія землі Віленшчыны і Гродзеншчыны і ніякіх актаў аб дзяржаўнай прыналежнасці гэтых зямель, заключаных трэцімі асобамі паміж сабою, не прызнае, тут жа змяшчае ўмовы іх перадачы. У заяве знаходзіцца прапанова важная для разумення знешнепалітычнай накіраванасці: урад БНР у выпадку калі "будзе запрапанавана Літве перадача беларускай зямлі да лініі Рыжскай Польска-Расейскай умовы (так званы другі "польскі" калідор) дае згоду на прыём Літвой гэтых зямель пад варункам, што этнаграфічна-беларускія землі будуць выдзелены у самастойную палітычную адзінку" [с. 1119]. (Але, як мы ведаем, яшчэ 12 ліпеня 1920 г. урад РСФСР без уселякіх умоў заключыў

дагавор з Літоўскаю Тарыбаю, па якому частка беларускіх зямель ўвайшла ў склад Літвы). Прапанова аддацца на волю Літоўскай рэспубліке была карыснаю: тым жа чыслом быў адпраўлены *"Зварот Рады Народных Міністраў БНР да Саюзу Прыбалтыйскіх Дзяржаваў за 30.05.1921 (вых. № 416) з просьбаю аб пазыцы ў суме 3 млн. ням. марак"* на барацьбу з акупантамі, у якім Беларусь называлася інтэгральнай часткай Прыбалтыкі, як ў геаграфічных, так і эканамічных адносінах [с. 1118]. Выказанае жаданне звязацца ў канфедэрацыю з Літвою не было галаслоўным: загадзя быў падрыхтаваны *"Праект дадатковага пагаднення да дагавору ад 11.11.1920 паміж Літвой і Беларусяй аб пашпартох для грамадзянаў Беларускай Народнай Рэспублікі, якія паходзяць з тэрыторыі, што знаходзіцца паводле Рыжскага дагавору пад часовай польскай акупацыяй"* [с. 1250]. Гэтай жа мэце паслужыў *"Даклад Ураду БНР аб палітычным стане Беларусі за 29.03.1921, падрыхтаваны для Ураду Літвы"* [с. 1064-1069], які змяшчаў каштоўныя сведкі аб палітыцы і эканоміцы краю як пад уладай бальшавікоў, так і пад польскай акупацыяй. Польска-літоўская праблема ў дакладзе прадстаўляецца спрэчкай аб лесе Гродзенскай і беларускай часткі Віленскай губерніі: «Самой желательной формой их устройства является передача их законному белорусскому правительству». Згодна з логікай дакументаў «Архіваў Беларускай Народнай Рэспублікі», больш за астатнія краіны такому вырашэнню тэрытарыяльнага пытання перашкаджала Польшча. Так, 16 чэрвеня 1921 г. ў гасцініцы"Metropol„г. Коўна членамі Рады Народных Міністраў быў састаўлены *"Пратэст Ураду БНР ...супраць прэтэнзій Польшчы на Віленшчыну й Градзеншчыну, пададзены на Канфэрэнцыю Лігі Нацыяў у Жэнэве"* [с. 1125]. Адсюль жа Вацлаў Ластоўскі адпраўляе ліст Яўгену Бачынскаму ў Жэневу 27 чэрвеня 1921 г., дзе выказвае свой погляд на склаўшуюся палітычную сітуацыю: "Бальшавікі хоць і стварылі "незалежную" Савецкую Беларусь, але гэта фікцыя...[Тут] пануе самы свірэпы цэнтралізм ды экономічнае і культурнае вынішчэнне беларусаў...Тут пануе нечуваны тэрор: закрыты беларускія школы, каапeратывы, уся свядомая беларуская сельская інтэлігенцыя знаходзіцца у лагерах і турмах... І гэта ў той час, калі гэтыя землі нікім, акрамя бальшавікоў не прызнаны за палякамі. Ад Антанты палякі маюць мандат толькі да лініі Керзона" [с. 1129-1130]. І ўсё ж быў зроблены чарговы захад удакладніць узаемаадносіны з Масквою. Другая частка *"Інфармацыйнай запісцы Аляксандра Галавінскага аб палітычным становішчы Беларусі, узьнікненьні й дзейнасці Ураду БНР, дачыненні да суседніх дзяржаў, складзеная на падставе дадзеных архіву Ураду БНР"* за 15.08.1921 г. пад назвай *"Періодъ отъ начала Рыжскаго прелиминарныхъ Русско-польскихъ переговоровъ до настоящаго времени"* прадстаўляе не толькі самае дэталёвае апісанне падзей, але і нечаканы ракурс вырашэння беларускага пытання ў Рызе. Паведамляецца, што згодна з дэкларацыяй ад 23 верасня 1920 г. кіраўніцтва РСФСР прызнавала суверэннасць Польскай Рэспублікі, а ў 1918 г. незалежнасць Украіны і Беларусі, і тым самым паставіла польска-расійскія перамовы ў новую фазу, г. зн. адмовілася ад правоў на беларускія землі і ад права выра-

шаць пытанне аб беларуска- польскай мяжы. Польская дэлегацыя, якая вяла перамовы ў будынку польскага пасольства ў Рызе, не адмовілася ад беларускіх зямель і не жадала прызнаць незалежную краіну, таму дэлегацыя БНР вымушана была скончыць гэты дыялог. У запісцы вылучаюцца асноўныя накірункі палітычнай канцэпцыі адносін ўрада БНР да Савецкай Расіі і БССР [с. 1184-1197]. *"Ліст Аляксандра Цвікевіча (Коўна) Яўгену Ляцкаму (Прага) за 15.01.1922"* сведчыць, што і ў пачатку 1922 г. захаваліся спадзяванні, што Расія яшчэ ўздыме пытанне аб перагляддзе Рыжскай дамовы і аб устанаўленні ўсходніх межаў Польшчы [с. 1266-1267].

Адначасова з наладжваннем цесных дыпламатычных стасункаў з Літвою, беларускія дзеячы не замінаді сувязей з міжнароднымі коламі. *"Мемарандум Ураду БНР да Высокай Канфэрэнцыі Вялікіх Дзяржаваў у Вашынгтоне"* (1921.11.24.), нягледзячы на афіцыйны змест, напоўнены драматызмам і роспаччу. Рыжскі мір паўстае ў ім "чудовищным экспериментом, заключенным через голову суверенного Белорусского Народа". Прадбачліва падкрэсліваецца часовы, нетрывалы характар дагавору, які стане новым повадам да вайны. Небяспекаю для беларусаў выступае не толькі іх раз'яднанне. Польшча захапіла рынак сыравіны і рынак збыту тавараў; Расія прымусіла край існаваць "вне сферы своих хозяйственных перспектив и к тому же не располагает и не может доставить необходимых кредитов для упорядочения хозяйственно-экономической жизни разорённой Белоруссии...В обезлюдевших уездах, оккупированной [Польшей] ...Белоруссии количество населения на квадратный километр упало с 45 до 10» [с. 1248]. У прыведзеным дакуменце патрабаванні ўрада БНР не былі як след падтрыманы дэталевай распрацоўкай, аргументацыяй ў свой бок.

У больш познім дыпламатычным звароце да Лігі Нацый знаходзяцца канкрэтныя высновы ў абарону сваёй пазіцыі. Адчуваецца цвёрдае перакананне, што гістарычная справядлівасць будзе аднаўлена з дапамогай заходніх краін ў лісце Пятра Крэчэўскага (Прага) Вацлаву Ластоўскаму і Аляксандру Цвіковічу (Коўна) за 1.02.1922 г.: «Калі ў Генуі паўстане пытанне аб усходніх граніцах Польшчы і Рыжскім міру, то ўстане пытанне і аб Беларусі. Тэрыторыя у 250 т. кв. км. можа і для Еўропы дать нешта, апрача міру на Усходзе» [с. 1274]. Дарэчы, сам *"Мемарандум Ураду БНР на канфэрэнцыі дзяржаваў у Генуі"* (27.02.1922 г.) змяшчае, па-першае, тлумачэнне гістарычных высноў імперыялістычнага саперніцтва Польшчы і Расіі за беларускія землі; па-другое, сцвярджэнне, што гэтыя краіны хаця і "прызналі незалежнасць Беларусі", але тым не менш "падзялілі паміж сабою тэрыторыю". На той момант гаворка ішла аб прызнанні толькі БССР. Мяжа Рыжскага згаднення ў мемарандуме называецца лініяй, па якой выпадкова спынілася звяканне польска-расійскай зброі, і якая ізноў абярнецца лініей польска-расійскага фронту. Нарэшце, зварот да Канферэнцыі дзяржаў у Генуі змяшчаў чарговую просьбу паставіць у праграму пытанне аб перагляддзе Рыжскага міра і, як вынік адмены яго, прызнаць незалежнасць БНР. Узамен прапанаваліся лясныя багацці - 18.9 млн. га, рэкі Беларусі, торф - 500 млн. штогод, якія маюць таргова-прамысловае значэнне для Усходняй Еўропы і чакаюць "дастасавання саліднага капіталу" [с. 1288].

Такім чынам, урад БНР ацаніў Рыжскі мірны дагавор 1918 г. як грабежніцкі, часовы акт, які не адпавядаў інтарэсам беларусаў. Палітыкі праяўлялі ініцыятыву, каб умовы савецка-польскага міру былі перагледзены з дапамогай заходніх краін, але, спекуляцыя за падтрымку, як ім здавалася, найбольш прывабным аргументам - прыроднымі багаццямі краю, не знайшла водгуку. Надзеі на вырашэнне беларускага пытання савецкім і польскім бокам былі дарэмнымі і заўчаснымі: землі Беларусі аб'ядналіся пад савецкім сцягам толькі ў 1939 г. Дакументы выдання даюць уяўленне аб дыпламатычных зносінах, насычаны фактамі аб пасляваенным становішчы дзяржаў Усходняй Еўропы. Глыбокі аналіз апублікаваных дакументаў, а таксама выяўленне новых у раней закрытых архівах і ўключэнне іх у навуковы ўжытак, адкрывае перад даследчыкамі перспектыву больш грунтоўнага і ўсебаковага асвятлення гісторыі Рыжскага мірнага дагавору 1921 г.

СПИСОК ЛИТЕРАТУРЫ:


1. Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі - Archives of the Belarusian democratic republic / [Уклад., падрыхт. тэксту, уступ. арт., камент.,пер., паказ. С.Шупы]. - Нью-Йорк і інш. : Бел. ін-т навукі і мастацтва: Т-ва бел. пісьменства "Наша ніва", 1998. - (Bibliographic series; № 4). У вых. дан. таксама: Вільнюс, Мінск, Прага.
2. Т. 1., кн. 1:Фонд № 582 Дзяржаўнага архіва Літвы ("Рада Міністраў Беларускай Народнай Рэспублікі").- 850, [16] с.: іл. - Ч. тэксту: пол., англ. і фр. - ISBN 9986-9219-2-9 (у пер.): Б.ц.
3. Т. 1, кн. 2: фонд № 582 Дзяржаўнага архіва Літвы ("Рада Міністраў Беларускай Народнай Рэспублікі"). - с. 851-1721, [4].- Ч. тэксту: пол., англ., фр., рус. - Бібліягр.: с. 1641-1653. - Паказ. імен., прадм.: с. 1654-1721.